## Дзе нарадзілася, расла…

***“Будзь удзячны за ўсё Богу, за пражыты дзень святы…” – так называлася святочная вечарына, якая адбылася ў Васільеўскай сельскай біліятэцы Добрушскага раёна. Госць – пісьменніца Ганна Атрошчанка.***

Вяскоўцы слухалі новыя творы і пачулі шмат цікавага з жыцця пісьменніцы. Паэтэса і празаік нарадзілася і вырасла на Добрушчыне і ў свой час вучылася менавіта ў Васільеўскай школе (з нядаўняга часу яна закрыта, але будынак школы не пустуе, тут размясціліся сельская бібліятэка, клуб ды шмат чаго іншага), таму і невыпадкова сустрэча стала цікавай і сардэчнай.

Землякі пісьменніцы і арганізатары вечарыны – загадчыца сельскага клуба Галіна Філімонцава і бібліятэкар Алена Дзергачова – пажадалі, как Ганна Мікалаеўна як мага часцей завітвала ў родны куток.

**Улад Прыазёрны**